# *Прэзідэнт прыняў кіраўніка ўрада*

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка 2 лютага 2000 года прыняў з дакладам прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь С. С. Лінга.

Як паведаміла прэс-служба кіраўніка дзяржавы, прэм'ер-міністр далажыў аб выніках перагавораў і сустрэч, праведзеных у Маскве. На сустрэчы з першым віцэ-прэм'ерам урада Расіі М. М. Касьянавым бакі ўзгаднілі далейшае збліжэнне ўмоў гаспадарання ў рамках рэалізацыі Дагавора па стварэнню аднолькавых умоў для суб'ектаў гаспадарання дзвюх краін. У ходзе перагавораў М. М. Касьянавым падтрымана прапанова аб заліку матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў і прадуктаў харчавання за энергарэсурсы, што пастаўляюцца ў Беларусь. Бакі дамовіліся прапрацаваць і падпісаць двухбаковае пагадненне, згодна з якім падатак на дабаўленую вартасць будзе брацца па месцы прызначэння тавараў.

На сустрэчы з кіраўніком РАТ «ЕС Расіі» А. Б. Чубайсам вызначаны пазіцыі і агульныя пункты па пытаннях паставак і транзіту электраэнергіі, разлікаў за яе. Прэзідэнт даручыў ураду дэталёва прапрацаваць пытанні паставак, транзіту электраэнергіі, цэнавай палітыкі і прадставіць кіраўніку дзяржавы дакладную схему, якая рэгулявала б гэта пытанне.

Прэзідэнту Беларусі далажана таксама, што ў ходзе сустрэчы з прэм'ер-міністрам Украіны В.А.Юшчанкам дасягнута дамоўленасць аб пачатку практычнага вырашэння пытання па доўгу Украіны перад Беларуссю, які ўтварыўся на пачатку 90-х гадоў пасля распаду СССР.

Прэзідэнт праінфармаваны, што знойдзены агульныя падыходы па ўзаемапастаўках збожжа з Казахстана і трактароў з Беларусі ў ходзе сустрэчы прэм'ер-міністра Беларусі С. С. Лінга з прэм'ерам Казахстана К. К. Такаевым.

Кіраўнік дзяржавы інфармаваны аб наяўнасці і выкарыстанні запасаў і дзяржрэзерваў прадуктаў харчавання і гаруча-змазачных матэрыялаў. Запасы ГЗМ створаны на ўзроўні мінулага года, запасы прадуктаў харчавання значна перавышаюць мінулагодні ўзровень, што забяспечвае неабходную падтрымку харчовага рынку рэспублікі, а таксама выкарыстанне іх у разліках за энерганосьбіты.

У ходзе даклада была абмеркавана сітуацыя, якая склалася ў сферы дробнага прыватнага бізнесу. Прэзідэнт даручыў ураду аператыўна разгледзець магчымасць арганізацыі закупак і аптовага гандлю таварамі шырокага спажывання на рэчавых рынках рэспублікі з мэтай стварэння канкурэнцыі.

На сустрэчы былі разгледжаны і іншыя пытанні.

**БЕЛТА.**